УДК 726.9 (476)

# СУЧАСНАЯ ПРАВАСЛАЎНАЯ КАПЛІЦА Ў АРХІТЭКТУРНАЙ КАМПАЗІЦЫІ ПАСЕЛІШЧАЎ БЕЛАРУСІ

Арабей В. Г., БНТУ, г. Мінск

Дзякуючы сацыяльным пераменам, якія адбыліся ў Беларусі напрыканцы ХХ стагоддзя, ў архітэктурную кампазіцыю паселішчаў вярнуліся культавыя пабудовы, асаблівае месца сярод якіх займаюць капліцы. Параўнальна з храмам, капліца ў першую чаргу – сакральны знак, дзе асноўная ўвага сканцэнтравана на экстэр'ерным рашэнні. У залежнасці ад велічыні паселішча, капліцы могуць адыгрываць разнастайныя ролі ў архітэктурнай кампазіцыі: горадабудаўнічыя дамінанты ў весках і паселках, горадабудаўнічыя акцэнты у горадзе, гарманічнае дапаўненне ландшафтных кампазіцый міжсялібных тэрыторый і паселішчаў.

Актыўнае будаўніцтва капліц знайшло адлюстраванне ў вялікім тыпалагічным спектры дадзеных пабудоў, сярод якіх можна вылучыць капліцы: богаслужбовыя, пры ўстановах, вадасвятныя, дарожныя, на могілках, мемарыяльныя. Для кожнага тыпу характэрна свая духоўная місія, спецыфіка выкарыстоўвання і горадабудаўнічая роля.

Грунтуючыся на аналізе станоўчых і адмоўных рашэнняў апошніх 20 гадоў будаўніцтва праваслаўных капліц, іх ролі ў архітэктурнай кампазіцыі паселішчаў, спецыфіцы выкарыстоўвання, намі былі распрацаваны рэкамендацыі, якія дазваляюць найлепшым чынам раскрыць горадабудаўнічы патэнцыял дадзенага тыпу культавых пабудоў і збудаванняў: дыферэнцыявана размяшчаць капліцы ў архітэктурнай кампазіцыі паселішчаў адпаведна тыпу: а) богаслужбовыя капліцы – у цэнтральных частках паселкаў і весак, на галоўных вуліцах, са стварэннем плошчы перад будынкам; б) капліцы пры ўстановах – у найбольш рэпрэзентатыўных зонах устаноў, на асноўных пешаходных шляхах, побач з месцамі адпачынку; в) вадасвятныя капліцы – ва ўваходнай зоне духоўнага комплекса; г) дарожныя – пры ўездзе ў паселішчы, побач з транспартнымі развязкамі, на міжсялібных дарогах; д) на могілках – на ўзвышаных і адкрытых месцах для найлепшага ўспрымання з асноўных пад'ездаў і дарог; е) мемарыяльныя – на ландшафтных тэрыторыях, у арганічным спалучэнні з мемарыяльнымі комплексамі;

Агульныя рэкамендацыі для ўсіх тыпаў: 1) выкарыстоўванне горадабудаўнічых і архітэктурна-мастацкіх якасцяў капліц пры стварэнні архітэктурнай кампазіцыі горада (дамінантнасць, акцэнтаванне, сілуэтнасць, візуальная арыентацыя і інш.); 2) ужыванне традыцыйных горадабудаўнічых рашэнняў і самабытных вобразаў для стварэння нацыянальнага каларыту архітэктурнага асяроддзя паселішчаў.